# Эсэ “Слова ў вокладцы”

Нам кніга – вечнае святло,
Крыніца ведаў, цуд бясконцы!
І параўняцца з ёй магло б,
Відаць, у свеце толькі сонца.
М. Пазнякоў

Уся гісторыя цывілізацыі - гэта гісторыя бесперапыннай барацьбы за заваяванне прасторы і часу. Людзі вынайшлі для гэтага шмат сродкаў: аўтамабіль, самалёт, радыё, тэлебачанне і, нарэшце, касмічны карабель. Але ёсць толькі адзін сродак пераадолець час - гэта кніга, друкаванае слова. Хвала кнізе як захавальніцы духоўных багаццяў чалавецтва, аднаму з найважнейшых і самых трывалых звёнаў, якія злучаюць пакаленні, што звязваюць мінулае, сучаснае і будучае. Бо як сказаў Чарльз Дзікенс: “З усіх вынаходстваў і адкрыццяў у навуцы і мастацтве, з усіх вынікаў дзіўнага развіцця тэхнікі на першым месцы знахозіцца кнігадрукаванне… “

Хто ж з нас у дзяцінстве не хацеў падарожнічаць у часе? Ну, прызнавайцеся! Так, так, бачу, што хацелі амаль усе. Але пачакайце, для гэтага неабавязкова мець машыну часу. Што? Вы пытаецеся ў мяне: “А як жа без яе?” Гэта вельмі проста. Глядзіце, што ў мяне ёсць. Ну, глядзіце ж! Гэта зусім не падобна на нейкую машыну. Гэта рэч існуе на нашых землях амаль больш за дзесяць стагоддзяў. Бачу, што вы здагадаліся, што гэта – кніга. Адкрываем яе і трапляем: хочаш у XVIII стагоддзе, а хочаш – у XIX, а можна нават і Старажытную Русь пабачыць. А вось адкрыйце другую старонку – і вы ўжо ў будучыні. Вы разумееце? Усё вельмі проста.

Думаю зараз вы задумаліся аб тым, якую кнігу абраць, калі іх так шмат. Ды і гэта зусім не складана. Я, напрыклад, раю вам чытаць як мага больш беларускіх казак. Чаму менавіта казак? Не толькі таму, што яны вельмі цікавыя. Беларускія казкі – гэта скарбонка народнай мудрасці. Чытаючы іх, вы зразумееце нашы традыцыі, побыт і нават правілы чалавечых паводзін. Гэта тое, што перадаецца з малаком маці, ідзе праз пакаленні. А яшчэ казкі - гэта скарбонка добрага народнага гумару.

Калі яшчэ не было на нашых землях пісьменства, ужо тады існавалі свае паэты, казачнікі. Іх творы хадзілі па народзе, а самыя адметныя запаміналіся і перадаваліся далей з вуснаў у вусны. Так фарміраваўся народны фальклор, найцікавейшы і найбагацейшы.

А яшчэ я раю вам зацікавіцца беларускай гісторыяй. Ёсць шмат твораў на гэтую тэму. Наш выдатны беларускі драматург Аляксей Дудураў напісаў цэлае сузор’е твораў у жанры гістарычнай драмы: “Князь Вітаўт”, “Купала”, “Палачанка”, “Чорная панна Нясвіжа”, ”Ядвіга”, “Песня пра зубра” – сцэнічная варыяцыя паэмы Міколы Гусоўскага. Усе гэтыя творы адлюстроўваюць больш за тысячагадовую гісторыю нашай краіны.

Гісторыя з'яўлення кніг вельмі цікавая. Кніга існуе значна даўжэй, чым кнігадрукаванне. На працягу доўгіх стагоддзяў яна змяняла сваю форму ў залежнасці ад узроўню грамадскага развіцця і грамадскага прызначэння, а таксама ад даступных той ці іншай эпосе матэрыялаў і тэхнікі. Аднак толькі вынаходства кнігадрукавання адкрыла свет духоўных багаццяў шырокаму колу людзей і тым самым спрыяла развіццю навукі, тэхнікі, грамадскай думкі.

У Еўропе пачынальнікам кнігадрукавння стаў Іаган Гутэнберг. Ён аказаў уплыў не толькі на еўрапейскую культуру, але і на сусветную гісторыю. З нямецкай зямлі кнігадрукаванне прыйшло і на нашыя землі.

Росквіт беларускай літаратуры наступіў у XVI ст. Гэтаму дапагла шматгранная дзейнасць асветніка-гуманіста, пісьменніка, першадрукара, перакладчыка Францыска Скарыны. Першую паэму аб роднай зямлі напісаў на лацінскай мове Мікола Гусоўскі, Сымон Будны выдаў у Нясвіжы “Катэхізіс”.

Ну што? Усё  яшчэ не ведаеце, якую кнігу ўзяць, усё яшчэ не да канца ўпэўнены ў сваім выбары? Што ж, буду дапамагаць вам да апошняга, калі так трэба.

Звернемся да літаратуры XX ст. Якуб Колас, Янка Купала, Алаіза Пашкевіч, Максім Багдановіч, Францішак Багушэвіч. Усе гэтыя выдатныя імёны пісьменнікаў спрыялі найбуйнейшаму росквіту беларускага пісьменства.

Дык вось жа як прыйшла вясна жаданая на свет,
Калоцячы, як ліпай, змучанай зямлёй да дна.
Крывёй, пажарам, пошасцям – людзям яе прывет,
А надпіс на яе агнёвым знамені: Вайна!

Бачыце, спадарства?! З гэтых радкоў нібы мінуўшчына размаўляе з намі. Шмат палітычных і грамадскіх падзей здарылася ў тыя даўнія часы. І пісьменнікі нібы запрашаюць нас прайсці па мосце ад сучаснага да мінулага, па тым мосце, па якім прайшло ўжо не адно пакаленне.

І толькі краіна адышла ад рэвалюцыйнага жаху, і вось вам новае пекла - другая сусветная вайна. І пра гэты трагічны перыяд было напісана шмат твораў. Галоўнымі тэмамі беларускай літаратуры тады сталі ваенныя падзеі, ваенная вёска. Пра гэта добра распавядаюць аповесці Янкі Брыля, Івана Мележа, Івана Шамякіна. Асобае месца займае творчасць паэтаў-франтавікоў Аркадзя Куляшова, Аляксея Пысіна. У іх вершах раскрываюцца асноўныя тэмы кожнай вайны. Мужнасць, адвага, подзвіг, ахвярнасць, патрыятызм - асноўныя якасці герояў гэтых твораў. Выбар у іх невялікі, бо калі стаіш пад ружжом, у цябе толькі два шляхі: альбо ты герой, альбо здраднік, трэцяга не дадзена.

З другой паловы 1960-х гадоў узыходзяць зоркі Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава, Андрэя Макаёнка, Івана Пташнікава. У іх творах разглядаюцца вельмі важныя пытанні свабоды творчасці, маральнага выбару,

была ўпершыню закранута тэма Сталінскага ГУЛАГу, расстрэлаў у 1937 - ым, калектывізацыя. Гэта ўсё вельмі добра адлюстроўваецца ў творы Васіля Быкава “Знак бяды”.

Ну што, панове? Як бачу, вы заўважылі, што адначасова з літаратурай я кранаю страронкі славутай беларускай гісторыі. А ўсё таму, што гісторыя вельмі моцна ўплывае на погляды пісьменнікаў. І падзеі, якія адбываліся ў тыя часы, вельмі часта знаходзяць адлюстраванне ў іх творах.

Што ж, вось мы і падышлі да сучаснай беларускай літаратуры. Хіба гэта не прыемна жыць з вялікімі пісьменнікамі ў адзін час, бачыць іх па тэлевізары, чытаць пра іх у інтэрнэце, а яшчэ лепш сустэцца у асабістым жыцці?! Я, напрыклад, спадзяюся калі-небудзь узяць аўтограф у Святланы Алексіевіч. Яе творы “Чарнобыльская малітва”, “У вайны не жаночае аблічча”, “Цынкавыя хлопчыкі” вельмі ўздзейнічаюць на эмацыянальны стан чытачоў. Чытаеш і не верыш, што гэтыя людзі жывуць побач з табой. Лёс… Просты чалавечы лёс, на долю якога выпала вялікая чарнобыльская трагедыя. І хто ў гэтым павінен: Бог, які дапусціў такое, альбо людзі, якія па-чалавечы не могуць жыць? Дакладны адказ мы ўсё роўна ніколі не атрымаем.

Ну вось і ўсё, спадарства! Але перад тым, як з вамі развітацца, я хачу звярнуцца да вас, чытачоў.

Я не ведаю, хто вы, як вашае імя, дзе вы жывеце, вучыцеся ці працуеце. Я проста хачу, каб вы заўсёды ведалі, як малітву, гісторыю сваёй краіны, яе культуру, літаратуру, асветнікаў. На працягу стагоддзяў усё, што мы зараз ведаем, накоплівалася, перадавалася з вуснаў у вусны, друкавалася і практычна цудам захавалася да нашых дзён. І наша задача не толькі захаваць усё гэта, але і ўзбагаціць. Гісторыя адраджае слова. І тое, што застанецца нашым нашчадкам, залежыць толькі ад нас. Ну а зараз у добры час! Няхай кожны з вас напіша свой уласны працяг…